Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый
Кафедра гісторыка-культурнай спадчыны

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
__________ Д.В. Герасімёнак
“___”__________ 2024 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
___________Ю. М. Галкоўская
“___” __________2024 г.

ВУЧЭБНА – МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# АХОВА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

для спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны

Складальнік: А.Я. Паўлава дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Разгледжаны і зацверджаны на пасяджэнні Савета факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый 19 снежня 2024 г., пратакол № 4

Рэцэнзенты:

*Кафедра* этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў БДУ

*Кавалёва Ю.В.*, загадчык аддзела экспазіцыйна-выставачнай работы Дзяржаўнай установы "Музей гісторыі горада Мінска", кандыдат культуралогіі

Разгледжаны і абмеркаваны на паседжанні кафедры гісторыка-культурнай спадчыны (пратакол ад 22 лістапада 2024 г. № 4)

## ЗМЕСТ

1 ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА ……………………………….………….4
АХОВА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ…………………………4
2 ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ………………………………………………....7
2.1 План-канспект лекцыйнага курса…………………………………..………. 7
3 ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ……………………………………………………..19
3.1 Тэматыка семінарскіх заняткаў ………………………………………….. 19
3.1 Семінарскі занятак 1 Ахова культурных каштоўнасцей у СССР і БССР .19
3.2 Семінарскі занятак 2 Напрамкі дзяржаўнай палітыкі ў сферы культуры..19
3.3 Семінарскі занятак 3 Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь………………………………………………20
3.4 Семінарскі занятак 4 Наданне і пазбаўленне статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь…………………………………21
3.5 Семінарскі занятак 5 Уліковыя дакументы і Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь………………………………….22
3.6 Семінарскі занятак 6 Ахоўныя зоны……………………………………..22
3.7 Семінарскі занятак 7 Ахова помнікаў архітэктуры……………………..23
3.8 Семінарскі занятак 8 Увоз і (або) вываз, вяртанне культурных каштоўнасцей……………………………………………………………………24
4 РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ ………………………………………26
4.1 Заданні для самастойнай работы студэнтаў ……………………………26
4.2 Пытанні для экзамена…………………………………………………….27
4.3. Дыягностыка сфарміраванасці кампетэнцый студэнта …………………..29
5 ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ ………………………………………………..35
5.1 Тэматычны план ………………………………………………………35
5.2 Асноўная літаратура……………………………………………………...37
5.3. Крыніцы …………………………………………………………………37
5.4 Дадатковая літаратура і крыніцы………………………………………..44

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбна–метадычны комплекс па курсу “Ахова гісторыка-культурнай спадчыны”для студэнтаў спецыяльнасці 6-05-0322-03 “Музейная справа і ахова гісторыка–культурнай спадчыны” (па профілях) распрацаваны ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі ад 13.01.2011 г.; адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі АСВА 6-05-0322-03-2023 Музейная справа і ахова гісторыка–культурнай спадчыны, зацверджаным Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь 23.08.2023 №274; вучэбным планам ўстановы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па профілях) і графікам адукацыйнага працэсу. Рэгістрацыйны нумар 6-05-03-29/23 вуч.ад 15.02.2023 г. Праграма вучэбнай дысцыпліны узгоднена з праграмамі іншых вучэбных дысцыплін, якія выкладаюцца на кафедры гісторыка-культурнай спадчыны.

Вучэбна-метадычны комплекс “Ахова гісторыка-культурнай спадчыны” прызначана для студэнтаў IV курса спецыяльнасці “Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны”.

Актуальнасць вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны» абумоўлена тым, што ў перыяд глабалізацыі асабліва важным становіцца захавання матэрыяльнай і нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Ахова гісторыка-культурнай спадчыны важны напрамак дзейнасці будучых спецыялістаў, які заключаецца ў захаванні гісторыка-культурных каштоўнасцей, пераўтварэнні культурных каштоўнасцей у аб’екты музейнага і турыстычнага паказу, актуалізацыі і інтэрпрэтацыі як нерухомых так і рухомых аб’ектаў спадчыны. У сувязі з гэтым вывученне прынцыпаў, метадаў, форм захавання і актуалізацыі спадчыны з’яўляецца неабходнай умовай падрыхтоўкі спецыялістаў у гэтай галіне.

Асноўная *мэта* вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны» - фарміраванне ў студэнтаў тэарэтычных ведаў і

практычных навыкаў у галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь.

*Задачы* вывучэння вучэбнай дысцыпліны: азнаёміць будучых спецыялістаў з заканадаўчай базай Рэспублікі Беларусь у галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны; даць студэнтам сістэмныя веды аб уліку, захаванні і прыстасаванні гісторыка-культурных каштоўнасцей; азнаёміць з асноўнымі відамі работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях.

Зместам вучэбнай дысцыпліны «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны» па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па профілях) прадугледжана фарміраванне наступных кампетэнцый у адпаведнасці з адукацыйным стандартам вышэйшай адукацыі:

Прафесійныя кампетэнцыі:

БПК -3 Аналізаваць і ацэньваць асноўныя гістраычныя падзеі і працэс, дасягненні сусветнай і айчыннай культуры, агульныя заканамернасці фаоміравання культурнай спадчыны;

БПК – 6 Вызначаць асноўныя этапы і крыніцы фарміравання культурнай спадчыны беларусі і комплекс яе характарыстык;

БПК-7 Валодаць сучаснымі методыкамі вывучэння. Актуалізацыі і інтэрпрэтацыі матэрыяльнай і нематэрыяльнай культурнай спадчыны;

СК-3 Выкарыстоўваць сучасныя веды аб культуры і тэндэнцыях яе развіцця ў музейнай. Турыстычнай і мэнэджэрскай дзейнасці, ахове культурнай спадчыны, педагагічным і аратарскім майстэрстве яе інтэрпрэтацыі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

*ведаць:*

– гісторыю станаўлення аховы гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі;
– асноўныя этапы і крыніцы фарміравання гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі;

– увесь комплекс характарыстык гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі;
– асноўныя прычыны страты і пагрозы знішчэння гісторыка-культурных каштоўнасцей Беларусі;

прынцыпы захавання гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі;

*умець*:

– аналізаваць крыніцы фарміравання гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі;
– даць характарыстыку гісторыка-культурнай каштоўнасці і абгрунтаваць яе ўключэнне ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (далей Дзяржспісе);
- вызначыць пагрозы існавання гісторыка-культурных каштоўнасцей Беларусі.

*валодаць*:

– асновамі юрыдычнай аховы гісторыка-культурнай спадчыны;
- метадалогіяй фарміравання гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь

Пры выкладанні вучэбнай дысцыпліны "Ахова гісторыка-культурнай спадчыны" ўлічваецца яе сувязь з вучэбнымі дысцыплінамі "Тэорыя і методыка музейнай справы", "Гісторыя музейнай справы", "Асновы навукова-фондавай і навукова-даследчай работы музеяў", "Тэорыя і гісторыя культуры", "Этналогія і этнаграфія Беларусі" і іншымі вучэбнымі дысцыплінамі, якія служаць падмуркам у набыцці прафесійных ведаў па спецыяльнасці «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны».

У адпаведнасці з вучэбным планам, на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны» прадугледжана 100 гадзін, з якіх 40 – аўдыторныя. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах: лекцыі – 24 гадзін, семінарскія заняткі – 16 гадзін.

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – экзамен.

# 2 ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 2.1 План-канспект лекцыйнага курса

***Уводзіны***

Змест і мэты вучэбнай дысцыплины “Ахова гісторыка-культурнай спадчыны”. Ахова гісторыка-культурнай спадчыны як напрамак культурнай дзейнасці, што ажыццяўляюцца ў мэтах зберажэння і памнажэння гісторыка-культурнай спадчыны і стварэння ўмоў для яе перадачы наступным пакаленням. Асноўныя дэфініцыі. Адлюстраванне ў помніках працоўнай дзейнасці чалавека ў розныя эпохі.

Заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры (2016). Адзіны прававы класіфікатар Рэспублікі Беларусь (2018).

Сувязь вучэбнай дысцыпліны з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі гуманітарнага кірунку. Формы навучання і кантролю. Агляд літаратуры па вучэбнай дысцыпліне.

### Раздзел I. Асаблівасці станаўлення і развіцця заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны

#### *Тэма 1. Ахова культурных каштоўнасцей на беларускіх землях у дасавецкі перыяд*

Ахова помнікаў гісторыі і культуры на Беларусі ў перыяд Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі. Імператарскія ўказы (1826, 1848) па зборы сведчанняў аб рэштках старажытнасцяў. Загады і даручэнні (1877, 1903) аб забароне разбурэнняў і перабудовы старажытных аб’ектаў. Дзейнасць Імператарскай археалагічнай камісіі (ІАК). Рэстаўрацыя і кансервацыя замкаў, храмаў. Дзейнасць П.П.Пакрышкіна. Археалагічныя раскопкі на тэрыторыі Беларусі (Е.Р.Раманаў, Г.Х.Татур, Я.Тышкевіч, А.Кіркор, В.А.Шукевіч і інш.). Археалагічныя карты Віленскай і Гродзенскай губерняў (Ф.В.Пакроўскі). Дзейнасць грамадскіх арганізацый па вывучэнні, сістэматызацыі і ахове помнікаў гісторыі і культуры.

#### *Тэма 2. Ахова культурных каштоўнасцей у БССР і СССР*

Фарміраванне дзяржаўных органаў па ўліку і ахове помнікаў у першыя гады савецкай улады. Закон “Аб забароне вывазу і гандлю за мяжой прадметаў асаблівага мастацкага і гістарычнага значэння” (1918). Дэкрэт “Аб рэгістрацыі, прыёме на ўлік і ахове помнікаў мастацтва і старажытнасцей, якія знаходзяцца ва ўласнасці прыватных асоб, грамадстваў і ўстаноў” (1918). Стварэнне Губернскіх камітэтаў па справах музеяў і ахововы помнікаў мастацтва, старажытнасцей, народнага побыту і прыроды (1918).

Вывучэнне помнікаў гісторыі і культуры ў даваенны час у БССР. Дзейнасць Інстытута беларускай культуры Акадэміі навук БССР.

Вывучэнне культурнай спадчыны ў Заходняй Беларусі. Дзейнасць Міністэрства веравызнання і народнай асветы. Дзейнасць рэстаўрацыйных акругоў і камісій. Інвентарызацыя і рэстаўрацыя помнікаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Другі з'езд рэстаўратараў Польшчы (1927). Закон аб апецы над помнікамі (1928). Улік і ахова помнікаў даўніны XVI-XVIII стст.

Ахова гісторыка-культурнай спадчыны ў пасляваенны перыяд. Дзейнасць Добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. Закон БССР "Об охране памятников культуры" (1969). Закон БССР "Об охране и использовании памятников истории и культуры" (1978).

### *Тэма 3. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны (канец XX – пачатак XXI стст)*

Заканадаўчыя і нарматыўныя прававыя акты, якія рэгулююць ахову гісторыка-культурнай спадчыны. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь (1994). Закон "Об охране историко-культурного наследия" (1992). Закон "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны" (2006). Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры (2016). Міжнародныя дагаворы, ратыфікаваныя Рэспублікай Беларусь (Дэкларацыі, Канвенцыі, Рэкамендацыі, Хартыі). Указы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Законы і іншыя кадыфікаваныя нарматыўныя акты. Пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. Пастановы і загады Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Рашэнні органаў мясцовага кіравання і самакіравання, якія рэгулююць пытанні аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

## Раздзел II. Дзяржаўная палітыка і дзяржаўнае кіраванне ў сферы культуры

### *Тэма 4. Дзяржаўнае кіраванне ў сферы культуры*

Паўнамоцтвы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у сферы культуры. Паўнамоцтвы Савета Міністраў і Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ў сферы культуры. Кампетэнцыі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, іншых дзяржаўных органаў у сферы культуры.

Узаемадзеянне ў сферы культуры дзяржаўных органаў з органамі тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання, грамадскімі аб'яднаннямі і іншымі юрыдычнымі асобамі, грамадзянамі, у тым ліку індывідуальнымі прадпрымальнікамі. Грамадскія назіральныя камісіі па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і іншыя кансультатыўныя органы (экспертныя фарміраванні) па пытаннях культуры. Супрацоўніцтва ў сферы культуры дзяржаўных органаў з камерцыйнымі арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі.

### *Тэма 5. Напрамкі дзяржаўнай палітыкі ў сферы культуры*

Дзяржаўныя праграмы «Культура Беларусі», накіраваныя на захаванне, развіццё, распаўсюджванне і (або) папулярызацыю культуры. Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 25.07.2016 № 289.

Крыніцы фінансавання ў сферы культуры. Сродкі рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў. Бюджэтны Кодэкс Рэспублікі Беларусь. Фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва. Дзейнасць фондаў для фінансавання культурнай дзейнасці. Спонсары і мецэнаты ў культуры. Асаблівасці фінансавання дзяржаўных арганізацый культуры. Дзейнасць устаноў культуры, якая прыносяць даход. Матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне ў сферы культуры

### *Тэма 6. Прававыя асновы міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы культуры*

Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры як прававая аснова міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы культуры. Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 21.11.2017 № 877 (рэд. ад 19.11.2020).

Фарміраванне міжнароднага заканадаўства ў галіне аховы культурнай спадчыны. Пакт Рэрыха (Вашынгтон,1935). Гаагская канвенцыя аб абароне культурных каштоўнасцей у выпадку ўзброенага канфлікту (1954). Дзейнасць Міжнароднай рады па захаванні помнікаў і славутых месцаў (ІКОМАС, 1965). Еўрапейская Канвенцыя аб ахове археалагічнай спадчыны (Лондан, 1969). Канвенцыя аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны (1972). Хартыя захавання гістарычных гарадоў і гарадскіх абшараў “Вашынгтонская хартыя” (Вашынгтон, 1987). Канвенцыя аб ахове падводнай культурнай спадчыны (2001 г.). Міжнародная Канвенцыя аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны (Парыж, 2003).

## РАЗДЗЕЛ III Дзяржаўны ўлік і ахова гісторыка-культурнай спадчыны

### *Тэма 7. Віды гісторыка-культурных каштоўнасцей*

Вызначэнне паняццяў “культурная спадчына”, ”гісторыка-культурная спадчына”, “культурная каштоўнасць”, “гісторыка-культурная каштоўнасць”. Класіфікацыя гісторыка-культурных каштоўнасцей: матэрыяльныя і нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці. Катэгорыі гісторыка-культурных каштоўнасцей. Віды матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Дакументальныя помнікі. Запаветныя мясціны. Помнікі архітэктуры. Помнікі гісторыі. Помнікі горадабудаўніцтва (11 помнікаў горадабудаўніцтва ў Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь). Помнікі мастацтва. Нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці. Катэгорыі гісторыка-культурных каштоўнасцей.

### *Тэма 8. Беларуская рэспубліканская навукова-метадычная рада і абласныя (Мінскі гарадскі) саветы па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны*

Прававая аснова дзейнасці Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады (далей Рада) па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны. Асноўныя задачы і кірункі дзейнасці Рады. Склад Рады. Навукова-метадычнае забяспячэнне ўліку, захавання, аднаўлення, утрымання і выкарыстання гісторыка-культурных каштоўнасцей

Абласныя (Мінскі гарадскі) саветы (далей саветы) па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны). Склад саветаў. Роля саветаў у садзейнічанні ахове гісторыка-культурнай спадчыны.

### *Тэма 9. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. "Спіс сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны" ЮНЕСКА*

Дзяржспіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Парадак уключэння культурных каштоўнасцей, якім нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці ў Дзяржспіс. Структура Дзяржспісу. Звесткі Дзяржспісу. Асаблівасці ўключэннія комплексу або ансамбля матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей у Дзяржспіс. Актуалізацыя звестак аб гісторыка-культурных каштоўнасцях. Сайт: gosspisok.gov.by

Уключэнне гісторыка-культурных каштоўнасцей у Спіс сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны ЮНЕСКА. Спіс сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны, Рэпрэзентатыўны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва, Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якая мае патрэбу ў тэрміновай ахове і іншыя спісы ЮНЕСКА ў адпаведнасці з міжнародным заканадаўствам. Беларускія аб'екты, абрады, звычаі, святы і рамёствы ў Спісах сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

### *Тэма 10. Вылучэнне культурнай каштоўнасці для надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці*

Парадак уключэння культурнай каштоўнасці ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей. Вылучэнне культурнай каштоўнасці з ліку існуючых альбо выяўленых. Адпаведнасць яе крытэрыям для надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці. Фіксацыя, навуковая апрацоўка, мастацкая ацэнка. Накіраванне прапановы ў аблвыканкам, Мінгарвыканкам. Падрыхтоўка абаснавання для надання культурнай каштоўнасці статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці. Разгляд прапаноў упаўнаважаным органам і прыняцця рашэння аб наданні статуса гісторыка-культурнай каштоўнасці і катэгорыі.

### *Тэма 11. Прафесійнае і выпадковае выяўленне культурнай каштоўнасці, якой можа быць нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці*

Прафесійнае выяўленне культурных каштоўнасцей, у тым ліку пры правядзенні археалагічных даследаванняў. Сутнасць прафесійнай навукова-даследчай дзейнасці. Фіксацыя, навуковая апрацоўка і мастацкая ацэнка выяўленай каштоўнасці. Паведамленне пра выяўленую культурную каштоўнасць у мясцовы выканаўчы і распарадчы орган базавага тэрытарыяльнага ўзроўню. Забяспячэнне мер па ахове выяўленай рухомай і нерухомай матэрыяльнай культурнай каштоўнасці.

Дзейнасць юрыдычнай асобы або грамадзяніна, у тым ліку індывідуальнага прадпрымальніка, якія выпадкова выявілі матэрыяльную каштоўнасць, якой можа быць нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці і якая на момант яе выяўлення не мела ўласніка. Меры па захаванні матэрыяльнай культурнай каштоўнасці. Выплата ўзнагароджання за выпадкова выяўленую культурную каштоўнасць, якая з’яўляецца скарбам і якой нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці. Дзеянні мясцовага выканаўчага і распарадчага органа базавага тэрытарыяльнага ўзроўню пры прафесійным альбо выпадковым выяўленні культурнай каштоўнасці, якой можа быць нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці

### *Тэма 12. Наданне і пазбаўленне статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь*

Парадак унясення прапаноў аб наданні культурным каштоўнасцям статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці. Фіксацыя, навуковая апрацоўка і мастацкая ацэнка культурных каштоўнасцей. Крытэрыі для надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці. Наданне культурнай каштоўнасці статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці, наступствы надання (ненадання) культурнай каштоўнасці статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Пазбаўленне матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці. Алгарытм разгляду прапаноў аб пазбаўленні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці помнікаў архітэктуры. Навуковае заключэнне аб немагчымасці навукова-абгрунтаванага аднаўлення. Прыняцце рашэння саветам па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны. Разгляд пытання аб пазбаўленні статуса гісторыка-культурнай каштоўнасці Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай радай па пытанням гісторыка-культурнай спадчыны. Рашэнне Міністэрства культуры. Асаблівасці пазбаўлення статусу помнікаў археалогіі.

### *Тэма 13. Уліковыя дакументы і Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь*

Пашпарт матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці. Запаўненне пашпарта па форме, устаноўленай пастановай Міністэрствам культуры ад 28

снежня 2016 г. № 89. Звесткі, якія ўносяцца ў пашпарт матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці лістом змяненняў.

Ахоўныя абавязацельствы. Форма ахоўнага абавязацельства ўстаноўленая пастановай Міністэрства культуры ад 28 снежня 2016 г. № 90. Правы, абавязкі і абмежаванні праў уласніка (карыстальніка) матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Дзейнасць мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў базавага тэрытарыяльнага ўзроўню у выпадку змянення звестак аб гісторыка-культурных каштоўнасцях. Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь. Парадак фарміравання, вядзення і выкарыстання Банка звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь.

### *Тэма 14. Захаванне гісторыка-культурных каштоўнасцей*

Меры па захаванні гісторыка-культурных каштоўнасцей. Сістэма арганізацыйных, прававых, эканамічных, матэрыяльна-тэхнічных, навуковых, інфармацыйных і (або) іншых мер, якія ажыццяўляюцца ў мэтах зберажэння і памнажэння гісторыка-культурнай спадчыны і стварэння ўмоў для яе перадачы наступным пакаленням

Забеспячэнне захавання нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Перамяшчэнне нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці ў мэтах яе аднаўлення. Агляды нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей. Складанне актаў агляду. Забеспячэнне захавання рухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Забеспячэнне захавання нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Ахоўная дошка. Асаблівасці ўсталявання ахоўнай дошкі. Форма ахоўнай дошкі.

Абарона гісторыка-культурных каштоўнасцей. Дзейнасць музеяў у галіне захавання гісторыка-культурнай спадчыны. Музеефікацыя як спосаб захавання аб’ектаў гісторыка-культурнай спадчыны. Дзве формы музеефікацыі:" пад музей "і" як музей", частковая (або" мяккая") музеефікацыя. Музеефікацыя помнікаў архітэктуры. Выбар формы і метадаў музеефікацыі вызначаецца тыпам помніка, яго гісторыка-культурнай каштоўнасцю і станам. Асаблівасці захавання сядзібна-ландшафтных комплексаў.

Рэстаўрацыя аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны ў Рэспубліцы Беларусь. Прыняцце дзяржаўных праграм, якія забяспечваюць абарону аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны ў Рэспубліцы Беларусь. Дзяржаўная праграма "Замкі Беларусі" (2011-2018 гг.). Дзяржаўная праграма "Культура Беларусі" . Аб'екты, уключаныя ў дзяржаўныя праграмы, і фінансаванне рэстаўрацыйных работ на іх.

### *Тэма 15. Ахоўныя зоны*

Праекты зон аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Парадак распрацоўкі і актуалізацыі горадабудаўнічай і землеўпарадкавальнай дакументацыі, а таксама іншай праектнай дакументацыі, рэалізацыя якой можа аказаць уздзеянне на нерухомыя матэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці. Тэхнічныя нарматыўныя прававыя акты. Зоны аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Ахоўная зона. Зона рэгулявання забудовы. Зона аховы ландшафту. Зона аховы культурнага пласта (слоя). Рэжымы утрымання і выкарыстання зон аховы. "Гісторыка-архітэктурны апорны план". "Схема ландшафтнага аналізу". "Схема межаў зон аховы гісторыка-культурнай каштоўнасці". Прадухіленне пагрозы захаванню матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Недапушчэнне пагаршэння ўмоў успрымання нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей.

### *Тэма 16. Права ўласнасці на культурныя каштоўнасці*

Прававое рэгуляванне пытанняў уласнасці на гісторыка-культурныя каштоўнасці. Пераважнае права набыцця долі ў праве агульнай уласнасці на гісторыка-культурную каштоўнасць. Рэгістрацыя абмяжаванняў, звязаная са статусам гісторыка-культурнай каштоўнасці. Правы ўласніка матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці. Правы ўласніка калекцыі. Абмежаванне правоў уласніка (карыстальніка) матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці, землекарыстальніка, на зямельным участку якога размешчана нерухомая матэрыяльная гісторыка-культурная каштоўнасць. Абавязкі ўласніка (карыстальніка) матэрыяльнай гісторыкакультурнай каштоўнасці, землекарыстальніка, на зямельным участку якога размешчана нерухомая матэрыяльная гісторыкакультурная каштоўнасць

### *Тэма 17. Віды работ, якія выконваюцца на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях*

Навукова-даследчыя, праектныя і рамонтна-рэстаўрацыйныя работы. Археалагічныя, архіўна-бібліяграфічныя і натурныя даследаванні. Рамонтна-рэстаўрацыйныя работы: аднаўленне, дапаўненне, кансервацыя, прыстасаванне, перамяшчэнне, рамонт, раскрыццё, рэгенерацыя, рэканструкцыя, Асноўныя прынцыпы рэстаўрацыі. Асаблівасці рэстаўрацыі рухомых і нерухомых культурных каштоўнасцей. Віды кансервацыі. Кансервацыя руін. Методыка рэстаўрацыйных работ.

Дазвол на выкананне навукова-даследчых і праектных работ. Выкананне работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях. Кіраўніцтва распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях. Навукова-метадычнае кіраўніцтва і аўтарскі нагляд. Узгадненне навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-

рэстаўрацыйных работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях. Прыняцце ў эксплуатацыю нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці, на якой выконваліся рамонтна-рэстаўрацыйныя работы. Адміністрацыйныя працэдуры ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны, якія ажыццяўляюцца Міністэрствам культуры па заявах грамадзян, юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў.

### *Тэма 18. Дакументальныя помнікі. Формы і метады іх захавання*

Вызначэнне дакументальнай спадчыны. Віды дакументальных помнікаў: акты дзяржаўных органаў, пісьмовыя, графічныя і аўдыявізуальныя дакументы, старажытныя і іншыя рукапісы, архіўныя дакументы, рэдкія друкаваня выданні). Архіўныя дакументы і іх юрыдычны статус. Нацыянальны архўны фонд. Функцыі дзяржаўнай установы "Нацыянальнай бібліятэкі Беларусь" і яе роля ў захаванні кніжных помнікаў. Дзяржаўны рэестр кніжных помнікаў Рэспублікі Беларусь. Уласнасць на кніжныя помнікі. Правы і абавязкі ўласнікаў. Асаблівасці захавання і выкарыстання дакументаў, якія залічаны ў культурна-гістарычны фонд Дзяржаўнага фонду каштоўных металаў і каштоўных камянеў Рэспублікі Беларусь. Цэнтр камплектавання і вывучэння дакументальнай спадчыны беларускага замежжа (2014). Праграма ЮНЕСКА "Памяць" (1992).

Формы і метады захавання дакументальнай спадчыны. Праблема фізічнага захавання рукапісных помнікаў. Кансервацыя (стабілізацыя) і рэстаўрацыя дакументальных помнікаў. Мікрафільмаванне. Мікрафішаванне. Факсімільнае ўзнаўленне арыгіналаў. Новыя тэхналогіі ў захаванні дакументальных помнікаў. Праблема захаванасці і забеспячэнне доступу да помнікаў

### *Тэма 19. Ахова помнікаў архітэктуры*

Паняцце архітэктурнай спадчыны, яго віды. Паняцце сапраўднасці (аўтэнтычнасці) архітэктурнай спадчыны. Помнікі архітэктуры ў Дзяржспісе і іншыя помнікі архітэктуры. Рэстаўрацыя аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны ў Рэспубліцы Беларусь.

Прыняцце дзяржаўных праграм, якія забяспечваюць абарону аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны ў Рэспубліцы Беларусь. Дзяржаўная праграма "Замкі Беларусі" (2011-2018 гг.). Дзяржаўная праграма "Культура Беларусі". Аб'екты, уключаныя ў дзяржаўныя праграмы, і фінансаванне рэстаўрацыйных работ на іх. Музеефікацыя сядзібна-палацавых комплексаў

Захаванне і прыстасаванне помнікаў грамадзянскай архітэктуры. Навукова-адукацыйныя, тэатральна-відовішчныя збудаванні, паштовыя станцыі, вакзалы, гандлёвыя рады, рэстараны, гасцініцы, жылыя будынкі як асобная катэгорыя грамадзянскай архітэктуры. Асаблівасці іх захавання.

Адлюстраванне ў помніках працоўнай дзейнасці чалавека ў розныя эпохі. Ахова помнікаў прамысловай архітэктуры. Вытворчыя майстэрні ў старажытным Гомелі. Вадзяныя і ветраныя млыны. Помнікі гідратэхнічнага і дарожнага будаўніцтва. Будынкі мануфактур, фабрык, заводаў.

Захаванне помнікаў абарончай архітэктуры.

Пастанова Савета Міністраў БССР аб стварэнні ў Рэспубліцы Беларусь Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту (1976). Структура музея. Праблемы фарміравання музеяў пад адкрытым небам. Формы захавання і прыстасавання помнікаў драўлянага дойлідства. Рэстаўрацыя дрэва. Метады кансервацыі дрэва. “Археалагічнае дрэва”. Методыка прафесара В.Я.Віхрова. Праблемы захавання помнікаў драўлянага дойлідства.

## *Тэма 20. Ахова помнікаў горадабудаўніцтва*

Архітэктурна-гістарычная простора. Аб’екты аховы ў складзе архітэктурна-гістарычнай просторы. Праблемы аховы архітэктурна-гістарычнай просторы.

Гістарычныя цэнтры гарадоў (14 помнікаў горадабудаўніцтва). Гарадскія гістарычныя прадмесці. Помнікі горадабудаўніцтва як комплексы гісторыка-культурных каштоўнасцей. Захаванне і аднаўленне ратуш. Даследаванне планіровачнай структуры забудовы або фрагментаў планіровачнай структуры забудовы гарадоў. Міжнародная хартыя захавання і рэстаўрацыі помнікаў і мясцінаў (Венецыянская хартыя, 1964).

Малыя гарады як крыніца і захавальніца гістарычнай і культурнай спадчыны. Мястэчкі Беларусі і спецыфічныя асаблівасці планіроўкі. Захаванне прынцыпаў развіцця і рэгіянальнай спецыфікі. Аднаўленне і ахова каштоўных і значымых будынкаў малых гарадоў. Архітэктурны савет краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы (АССЕЕ). Пытанне “Устойлівыя каштоўнасці архітэктуры малых гарадоў” на Кангрэсе Міжнароднага саюза архітэктараў (Стамбул, 1996).

Дзяржаўнае рэгуляванне архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасцю ў Рэспубліцы Беларусь.

## *Тэма 21.Ахова помнікаў археалогіі*

Ахова археалагічнай спадчыны як напрамак культурнай дзейнасці. Помнікі археалогіі ў Дзяржспісе і іншыя археалагічныя аб’екты і артэфакты. Улік археалагічных аб’ектаў і археалагічных артэфактаў. Рэестр археалагічных аб’ектаў. Рэестр археалагічных артэфактаў. Археалагічныя даследаванні. Археалагічныя палявыя работы: археалагічныя раскопкі, разведка, нагляд. Пошук і выяўленне археалагічных аб’ектаў і (або) археалагічных артэфактаў. Археалагічны конмплекс на р. Менке

Дазвол на права правядзення археалагічных даследаванняў. Камісіі па археалагічных аб’ектах і археалагічных артэфактах. Выкананне земляных, будаўнічых, меліярацыйных і іншых работ, ажыццяўленне іншай дзейнасці на тэрыторыі археалагічных аб’ектаў. Меры па ахове археалагічных аб’ектаў пры выкананні работ на тэрыторыі археалагічных аб’ектаў. Адміністрацыйныя працэдуры ў сферы аховы археалагічнай спадчыны, якія ажыццяўляюцца Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі і мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі па заявах грамадзян, юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў. Краснасельскія шахты па здабычы крэменю.

Музеефікацыя археалагічных аб’ектаў (гарадзішча Бярэсце, Тураўскае замчышча, археалагічны музей у Белавежскай пушчы)

### *Тэма 22. Ахова помнікаў гісторыі*

Помнікі гісторыі ў Дзяржспісе і іншыя помнікі гісторыі. Метады вылучэння і выкарыстання знакавых гістарычных аб’ектаў. Мемарыяльныя кватэры. Музеі прысвечаныя знакавым гістарычным падзеям і асобам. Мемарыяльныя ансамблі. Мемарыяльныя дошкі і іх асаблівасці. Мемарыяльныя помнікі вядомым гістарычным асобам і падзеям як месцы памяці. Праблемы захавання помнікаў гісторыі.

Аб’екты ваеннай спадчыны ў Дзяржаўным спісе. Пытанне пра статус военных пахаванняў як гісторыка-культурных каштоўнасцей. Пастанова Савета Міністраў “Аб ушанаванні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў”. Указ Прэзідэнта " Аб ушанаванні памяці аб загінуўшых пры абароне Айчыны і захаванні памяці аб ахвярах вайны”. Парадак дзяржаўнага ўліку воінскіх пахаванняў (пашпартызацыя). Рэгістр воінскіх пахаванняў і пахаванняў ахвяр войнаў Рэспублікі Беларусь і аўтаматызаваны банк даных "Кніга памяці Рэспублікі Беларусь”. Мэты і задачы ўшанавання памяці загінуўшых абаронцаў Айчыны. Асноўныя формы ўшанавання памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў. Мемарыяльныя комплексы. Надмагільныя помнікі. Хроніка “Памяць”. Дзяржаўны ўлік вайсковых пахаванняў.

### *Тэма 23. Ахова помнікаў мастацтваў*

Помнікі мастацтваў у Дзяржспісе і іншыя помнікі мастацтваў. Асаблівасці захавання помнікаў мастацтва: творы выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога і іншых відаў мастацтва. Умовы захавання помнікаў мастацтва ў дзяржаўных музеях Рэспублікі Беларусь. Тэмпературна-вільготнасны і светлавы рэжым у фондах і выставачных залах музеяў.

Асноўныя прынцыпы навуковай рэстаўрацыі і кансервацыі. Асаблівасці рэстаўрацыі алейнага жывапісу. Рэстаўрацыя тэмпернага жывапісу (у тым ліку рэстаўрацыя абразоў). Асаблівасці рэстаўрацыі скульптуры. Рэстаўрацыя дэкаратыўных тканін і скуры. Складанасці

рэстаўрацыі гістарычных габеленаў (шпалераў). Рэстаўрацыя антыкварнай мэблі. Умовы захавання твораў мастацтва ў музеях Рэспублікі Беларусь. Дзейнасць рэстаўратараў. Рэспубліканскі рэстаўрацыйны савет.

### *Тэма 24. Увоз і (або) вываз, вяртанне культурных каштоўнасцей*

Увоз і (або) вываз, вяртанне культурных каштоўнасцей. Адпаведнасць дзеянняў па перамшчэнні культурных каштоўнасцей Кодэксу аб культуры Рэспублікі Беларусь і іншым актам заканадаўства аб культуры, заканадаўству аб знешнеэканамічнай дзейнасці, заканадаўству аб мытным рэгуляванні, міжнароднымі дагаворамі. Канвенцыя аб мерах, накіраваных на забарону і папярэджанне незаконнага ўвозу і перадачы правоў уласнасці на культурныя каштоўнасці (1972). Супрацьстаянне «культурнай кантрабандзе». «Чорны рынак» гістарычных і культурных каштоўнасцей.

Вяртанне культурных каштоўнасцей. Асноўныя падыходы ў культурнай палітыцы Рэспублікі Беларусь па вяртанню культурнай спадчыны. Камісія пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь па выяўленню, вяртанню, сумеснаму выкарыстанню і ўвядзенню ў навуковы і культурны абарот нацыянальных культурных каштоўнасцей, якія апынуліся за межамі Беларусі (2009 г.). Палажэнні аб рэстытуцыі культурных каштоўнасцей Беларусі ў “Кодэксе аб культуры Рэспублікі Беларусь”(2016). Камісія па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны абарот культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца па-за межамі Беларусі і вынікі яе работы.

Кірункі выяўлення культурнай спадчыны Беларусі за межамі краіны. "Канцэпцыя выяўлення, апісання, уліку і выкарыстання дакументаў па гісторыі і культуры Беларусі, якія захоўваюцца за мяжой". Стварэнне Рэестра нацыянальных культурных каштоўнасцяў, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь.

Увядзенне ў навуковы і сацыякультурны зварот беларускіх культурных каштоўнасцей, што апыніліся за межамі РБ. Поспехі і перспектывы ў галіне вяртання культурных каштоўнасцей. Асноўныя напрамкі і формы дзейнасці па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні і ўвядзенні ў навуковы і культурны ўжытак культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь. Сайт -“Вяртанне: viartanne.by.

### *Тэма 25. Парушэнне заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны*

Асноўныя парушэнні заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Невыкананне абавязкаў па падпісанні і (або) захаванню патрабаванняў ахоўных абавязацельстваў. Парушэнне парадку і (або) умоў выканання работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях альбо здзяйсненне дзеянняў, якія ствараюць пагрозу гісторыка-культурным каштоўнасцям.

Незаконнае карыстанне знакамі, ахоўваемымі міжнароднымі дамовамі. Невяртанне на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Апаганьванне збудаванняў і псаванне маёмасці. Прысваенне археалагічных артэфактаў.Знішчэнне, пашкоджанне або страта гісторыка-культурных каштоўнасцяў або культурных каштоўнасцяў, якім можа быць нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Парушэнне рэжымаў утрымання і (або) выкарыстання зон аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Невыкананне патрабаванняў аб абмежаванні правоў уласніка гісторыка-культурнай каштоўнасці. Парушэнне парадку вайсковых пахаванняў альбо правядзення пошукавых работ. Незаконны пошук і абарот археалагічных аб'ектаў і артэфактаў. Крымінальная адказнасць. Наўмыснае знішчэнне або пашкоджанне гісторыка-культурных каштоўнасцяў або культурных каштоўнасцяў, якім можа быць нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці. Знішчэнне, пашкоджанне або страта гісторыка-культурных каштоўнасцяў або культурных каштоўнасцяў, якім можа быць нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці, па неасцярожнасці. Здзек над гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі

## 3 ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

### 3.1 Тэматыка семінарскіх заняткаў

Семінарскія заняткі разлічаны на набыццё практычных ведаў па адпаведнаму курсу.

Пры падрыхтоўцы неабходна карыстацца як асноўнай так і дадатковай літаратурай, рабіць неабходныя нататкі, імкнуцца да сварэння пэўных абагульненняў на падставе набытага фактычнага матэрыялу.

Форма выканання работы – напісанне рэферату, вусны адказ у выглядзе паведамлення, гутарка па тэме, удзел у калоквіуме.

**Семінарскія заняткі № 1**
**Ахова культурных каштоўнасцей у БССР і СССР**

1. Гісторыка-культурныя каштоўнасці і іх класіфікацыя.
2. Фарміраванне дзяржаўных органаў па ўліку і ахове помнікаў у першыя гады савецкай улады.
3. Вывучэнне помнікаў гісторыі і культуры ў даваенны час у БССР.
4. Дзейнасць Інстытута беларускай культуры Акадэміі навук БССР.
5. Вывучэнне культурнай спадчыны ў Заходняй Беларусі.
6. Ахова гісторыка-культурнай спадчыны ў пасляваенны перыяд.
7. Закон БССР “Об охране памятников культуры” (1969).
8. Закон БССР “Об охране и использовании памятников истории и культуры” (1978).

Літаратура

1.Мартыненко, И. Э. Правовая охрана историко-культурного наследия Республики Беларусь : учеб. пособие / И.Э. Мартыненко.- Гродно : ГрГУ им. Я. Купалы, 2017. – 561 с.

2.Михайлец, М. А. Охрана культурного наследия на международном уровне : пособие / М. А. Михайлец. – Минск : БГУ, 2017. – 231 с.

3.Несцярчук Л.М. Ахова гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі: Асноўныя этапы фарміравання, сучасны стан і перспектывы. – Мн.,2003. – 286 с.

4. Самусік, А. Ф. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі”. Вучэбны дапаможнік / А. Ф. Самусік . – Мінск: Экаперспектыва, 2013. – 367 с.

**Семінарскія заняткі № 2**
**Напрамкі дзяржаўнай палітыкі ў сферы культуры**

1. Дзяржаўныя праграмы, накіраваныя на захаванне, развіццё, распаўсюджванне і (або) папулярызацыю культуры
2. Крыніцы фінансавання ў сферы культуры. Сродкі рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў.

3. Фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва.
4. Дзейнасць фондаў для фінансавання культурнай дзейнасці.
5. Спонсары і мецэнаты ў культуры.
6. Асаблівасці фінансавання дзяржаўных арганізацый культуры.
7. Дзейнасць устаноў культуры, якая прыносяць даход.
8. Матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне ў сферы культуры

Літаратура

1. Аб некаторых пытаннях дзейнасці фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва: Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 13.12.2004 №601 (рэд. от 16.08.2019)// Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 20.12.2004, №195, 1/6077.

2. Кодекс Республики Беларусь "Бюджетный кодекс Республики Беларусь"// Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 01.08.2008, № 183, 2/1509.

3. Кодекс Республики Беларусь от 20.07.2016 № 413-З «Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры» // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 02.08.2016, 2/2412.

4.Мартыненко, И. Э. Правовая охрана историко-культурного наследия Республики Беларусь : учеб. пособие / И.Э. Мартыненко.- Гродно : ГрГУ им. Я. Купалы, 2017. – 561 с.

5. Сборник информационно-методических материалов по охране историко-культурного наследия Республики Беларусь – / сост. Ходор Г.Н. – Гомель, 2023. – 204 с.

## Семінарскія заняткі № 3
## Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Спісы сусветнай спадчыны ЮНЕСКА

1.Дзяржспіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Структура Дзяржспісу.
2. Парадак уключэння культурных каштоўнасцей, якім нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці ў Дзяржспіс.
3.Актуалізацыя звестак аб гісторыка-культурных каштоўнасцях. Сайт: gosspisok.gov.by
4.Уключэнне гісторыка-культурных каштоўнасцей у Спісы сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.
5.Спіс Сусветнай культурнай спадчыны,
6.Рэпрэзентатыўны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва,
7.Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якая мае патрэбу ў тэрміновай ахове.

Літаратура

1.Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь [Інфармацыйны рэсурс]: сайт gosspisok.gov.by.

2. Кодекс Республики Беларусь от 20.07.2016 № 413-З «Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры» // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 02.08.2016, 2/2412.

3.Мартыненко, И. Э. Правовая охрана историко-культурного наследия Республики Беларусь : учеб. пособие / И.Э. Мартыненко.- Гродно : ГрГУ им. Я. Купалы, 2017. – 561 с.

4.Михайлец, М. А. Охрана культурного наследия на международном уровне : пособие / М. А. Михайлец. – Минск : БГУ, 2017. – 231 с.

5.Несцярчук Л.М. Ахова гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі: Асноўныя этапы фарміравання, сучасны стан і перспектывы. – Мн.,2003. – 286 с.

6. Сборник информационно-методических материалов по охране историко-культурного наследия Республики Беларусь – / сост. Ходор Г.Н. – Гомель, 2023. – 204 с.

## Семінарскія заняткі № 4
## Наданне і пазбаўленне статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь

1.Парадак унясення прапаноў аб наданні культурным каштоўнасцям статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці.

2.Крытэрыі для надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці.

3.Наданне культурнай каштоўнасці статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці.

4. Алгарытм разгляду прапаноў аб пазбаўленні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці помнікаў архітэктуры.

5. Асаблівасці пазбаўлення статусу помнікаў археалогіі.

Літаратура

1. Кодекс Республики Беларусь от 20.07.2016 № 413-З «Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры» // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 02.08.2016, 2/2412.

2.Мартыненко, И. Э. Правовая охрана историко-культурного наследия Республики Беларусь : учеб. пособие / И.Э. Мартыненко.- Гродно : ГрГУ им. Я. Купалы, 2017. – 561 с.

3.Несцярчук Л.М. Ахова гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі: Асноўныя этапы фарміравання, сучасны стан і перспектывы. – Мн.,2003. – 286 с.

4. Самусік, А. Ф. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі”. Вучэбны дапаможнік / А. Ф. Самусік . – Мінск: Экаперспектыва, 2013. – 367 с.

5. Сборник информационно-методических материалов по охране историко-культурного наследия Республики Беларусь – / сост. Ходор Г.Н. – Гомель, 2023. – 204 с.

**Семінарскія заняткі № 5**
**Уліковыя дакументы і Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь**

1.Пашпарт матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці.

2.Ахоўныя абавязацельствы.

3.Правы, абавязкі і абмежаванні праў уласніка (карыстальніка) матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці.

4.Дзейнасць мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў базавага тэрытарыяльнага ўзроўню у выпадку змянення звестак аб гісторыка-культурных каштоўнасцях.

5.Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь.

6.Парадак фарміравання, вядзення і выкарыстання Банка звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь.

Літаратура

1.Кодекс Республики Беларусь от 20.07.2016 № 413-З «Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры» // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 02.08.2016, 2/2412.

2.Мартыненко, И. Э. Правовая охрана историко-культурного наследия Республики Беларусь : учеб. пособие / И.Э. Мартыненко.- Гродно : ГрГУ им. Я. Купалы, 2017. – 561 с.

3.Несцярчук Л.М. Ахова гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі: Асноўныя этапы фарміравання, сучасны стан і перспектывы. – Мн.,2003. – 286 с.

4. Самусік, А. Ф. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі". Вучэбны дапаможнік / А. Ф. Самусік . – Мінск: Экаперспектыва, 2013. – 367 с.

5. Сборник информационно-методических материалов по охране историко-культурного наследия Республики Беларусь – / сост. Ходор Г.Н. – Гомель, 2023. – 204 с.

**Семінарскія заняткі №6**
**Ахоўныя зоны**

1.Праекты зон аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей.

2.Ахоўная зона. Зона рэгулявання забудовы.

3.Зона аховы ландшафту. Зона аховы культурнага пласта (слоя).

4.Рэжымы утрымання і выкарыстання зон аховы. “Гісторыка-архітэктурны апорны план”. “Схема ландшафтнага аналізу”. “Схема межаў зон аховы гісторыка-культурнай каштоўнасці”.

5.Прадухіленне пагрозы захаванню матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей.

6.Недапушчэнне пагаршэння ўмоў успрымання нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей.

Літаратура

1.Мартыненко, И. Э. Правовая охрана историко-культурного наследия Республики Беларусь : учеб. пособие / И.Э. Мартыненко.- Гродно : ГрГУ им. Я. Купалы, 2017. – 561 с.

2.Михайлец, М. А. Охрана культурного наследия на международном уровне : пособие / М. А. Михайлец. – Минск : БГУ, 2017. – 231 с.

3.Несцярчук Л.М. Ахова гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі: Асноўныя этапы фарміравання, сучасны стан і перспектывы. – Мн.,2003. – 286 с.

4. Самусік, А. Ф. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі”. Вучэбны дапаможнік / А. Ф. Самусік . – Мінск: Экаперспектыва, 2013. – 367 с.

5. Сборник информационно-методических материалов по охране историко-культурного наследия Республики Беларусь – / сост. Ходор Г.Н. – Гомель, 2023. – 204 с.

## Семінарскія заняткі №7
## Ахова помнікаў архітэктуры

1.Помнікі архітэктуры ў Дзяржспісе і іншыя помнікі архітэктуры.

2. Захаванне і прыстасаванне помнікаў грамадзянскай архітэктуры.

3.Тэатральна-відовішчныя збудаванні, асаблівасці іх захавання.

4.Паштовыя станцыі, вакзалы.

5. Гандлёвыя рады

6.Пастанова Савета Міністраў БССР аб стварэнні ў Рэспубліцы Беларусь Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту (1976). Структура музея.

7.Праблемы фарміравання музеяў пад адкрытым небам. Формы захавання і прыстасавання помнікаў драўлянага дойлідства.

8. Рэстаўрацыя дрэва. Праблемы захавання помнікаў драўлянага дойлідства.

Літаратура

1.Мартыненко, И. Э. Правовая охрана историко-культурного наследия Республики Беларусь : учеб. пособие / И.Э. Мартыненко.- Гродно : ГрГУ им. Я. Купалы, 2017. – 561 с.

2.Михайлец, М. А. Охрана культурного наследия на международном уровне : пособие / М. А. Михайлец. – Минск : БГУ, 2017. – 231 с.

3.Несцярчук Л.М. Ахова гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі: Асноўныя этапы фарміравання, сучасны стан і перспектывы. – Мн.,2003. – 286 с.

4. Самусік, А. Ф. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі”. Вучэбны дапаможнік / А. Ф. Самусік . – Мінск: Экаперспектыва, 2013. – 367 с.

5. Сборник информационно-методических материалов по охране историко-культурного наследия Республики Беларусь – / сост. Ходор Г.Н. – Гомель, 2023. – 204 с.

## Семінарскія заняткі № 8
## Увоз і (або) вываз, вяртанне культурных каштоўнасцей

1. Палажэнні нацыянальнага заканадаўства Рэспублікі Беларусь пр ўвоз і (або) вываз культурных каштоўнасцей.
2. Міжнароднае супрацоўніцтва ў справе аховы культурных каштоўнасцей і міжнародныя арганізацыі.
3. Канвенцыя аб мерах, накіраваных на забарону і папярэджанне незаконнага ўвозу і перадачы правоў уласнасці на культурныя каштоўнасці (1972).
4. Вяртанне культурных каштоўнасцей. Паняцце рэстытуцыі.
5. Канвенцыя УНІДРУА “Аб выкрадзеных і незаконна вывезенных культурных каштоўнасцей” (Рым, 24 чэрвеня 1995 г.).
6. Вырашэнне пытання аб вяртанні гісторыка-культурнай спадчыны пасля распаду СССР.
7. Асноўныя напрамкі і формы дзейнасці па выяўленні, вяртанні, сумесным выкарыстанні.
8. Прынцыпы рэстытуцыі культурных каштоўнасцей Беларусі згодна “Кодэкса аб культуры Рэспублікі Беларусь”
9. Камісія пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь па выяўленню, вяртанню, сумеснаму выкарыстанню і ўвядзенню ў навуковы і культурны абарот нацыянальных культурных каштоўнасцей, якія апынуліся за межамі Беларусі
10. Увядзенні ў навуковы і культурны ўжытак культурных каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь.

Літаратура

1. Кодекс Республики Беларусь от 20.07.2016 № 413-З «Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры» // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 02.08.2016, 2/2412.

2.Михайлец, М. А. Охрана культурного наследия на международном уровне : пособие / М. А. Михайлец. – Минск : БГУ, 2017. – 231 с.

3.Несцярчук Л.М. Ахова гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі: Асноўныя этапы фарміравання, сучасны стан і перспектывы. – Мн.,2003. – 286 с.

# 4 РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЯ ВЕДАЎ

## 4.1 Заданні для самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа разлічана на набыццё практычных ведаў па адпаведнаму курсу.

Форма выканання работы – напісанне рэферату, вусны адказ, у выглядзе паведамлення, гутарка па тэме, удзел у калоквіуме (па выбару).

Пры падрыхтоўцы неабходна карыстацца як асноўнай так і дадатковай літаратурай. Кантроль за выкананнем СРС адбываецца ў адпаведнасці з дадатковым раскладам.

1.Вызначыць паняцце гісторыка-культурная кашоўнасць.

2.Назваць катэгорыі матэрыяльных і нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей.

3.Назваць першыя дзяржаўныя органы па ўліку і ахове помнікаў

4. Назваць першыя нармаыўныя акты савецкай улады ў галіне музейнай справы і аховы помнікаў

5.Што такое дзяржаўны ўлік гісторыка-культурных каштоўнасцей

6. Назваць парадак надання статуса гісторыка-культурнай каштоўнасці

7.Выдзеліць асноўныя праблемы і перспектывы ўдасканалення дзяржаўнага ўліку гісторыка-культурных каштоўнасцей

8.Вызначыць структуру Дзяржаўнага спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей

9.Выдзеліць асноўныя прынцыпы захавання аб’ектаў, што маюць гісторыка-культурную каштоўнасць

10.Назваць асноўныя зоны аховы нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцей

11.Што такое ахоўныя дошкі? Форма і змест ахоўнай дошкі

12. Назваць асноўныя формы ўласнасці гісторыка-культурнай каштоўнасці

13. Назваць асноўныя віды работ на аб’ектах, якія маюць гісторыка-культурную каштоўнасць

